**МЕТЭАРАЛАГІЧНАЯ ЛЕКСІКА
НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ**

***Н.У. Кузьменка*** *(МДПУ імя І.П. Шамякіна)*
Навуковы кіраўнік – Н.І. Новік-Шчарбенка, канд. філал. навук, дацэнт

Агульнапрызнана, што нацыя існуе да таго часу, пакуль існуе нацыянальная мова. Адказнасць за лёс роднага слова, нацыянальную свядомасць чалавека ляжыць, перш за ўсё, на сям'і, агульнаадукацыйнай школе, асабліва яе пачатковым этапе, бо, як слушна заўважыў В. Вітка, "колькі б ты ні пражыў: семдзесят, восемдзесят, дзевяноста, сто гадоў, але залаты запас ўсяго твайго жыцця, які абумовіў тваю чалавечую сутнасць, – гэта твае першыя гады, тваё маленства". Працэс навучання павінен арганічна спалучацца з выхаваннем павагі да роднай мовы, духоўнай і матэрыяльнай культуры Бацькаўшчыны.

Вялікія магчымасці для развіцця нацыянальнай самасвядомасці малодшых школьнікаў закладзены ва ўроках беларускай мовы. Цікавым і ўдзячным матэрыялам, які дапаможа дасягнуць пастаўленых мэт, з'яўляюцца творы пра з'явы прыроды: 1) пацешкі: *Зранку цэлы дзень дождж на вуліцы ідзе. Дождж руплівы, палівай, слаўны вырасце ўраджай!* (М. Пазнякоў); 2) вершы: *Ой, шумяць лясы зялёныя, рэчкі быстрыя цякуць. Над дубкамі ды над клёнамі хмаркі-лебедзі плывуць* (А. Сіткоўскі); 3) загадкі: *Спачатку падае, пасля ўстае, потым гасцінцы раздае* (дождж); 4) скорагаворкі і чыстагаворкі: *Ідзі, ідзі, дожджык, звару табе боршчык*; *Джа-джа-джа – багаты ўраджай, джу-джу-джу – па садзе хаджу, джы-джы-джы – ідуць дажджы*; 5) прыказкі: *Зіма на лета працуе, а лета – на зіму*; 6) прыкметы: *Ластаўкі лётаюць нізка перад дажджом*; *З бярозы цячэ многа соку – будзе дажджлівае лета.*

Пры вывучэнні лексікі можна правесці назіранне за воблакамі і прапанаваць вучням адказаць на пытанні: Як узнікаюць воблакі? Якога колеру бываюць воблакі? Што ўплывае на колер воблакаў? Што нагадваюць воблакі, на што яны падобныя? Чаму воблакі рухаюцца (плывуць)? Якія воблакі папярэднічаюць дажджу? Чаму воблакі бываюць цёмныя? Як узнікае маланка? Чаму грыміць гром? Якую прыгожую з'яву можна назіраць пасля дажджу? Як узнікае вясёлка? Чаму рознакаляровую дугу ў небе пасля дажджу назвалі вясёлкай? У якую пару года можна назіраць дождж? Калі патрэбен дождж? Што ў прыродзе чакае дажджу? Як можна дапамагчы раслінам у спякотны дзень?

Выкарыстанне метэаралагічнай лексікі на ўроках беларускай мовы дапаможа актывізаваць слоўнікавы запас малодшых школьнікаў, навучыць іх разважаць, рабіць вывады і элементарныя абагульненні, будзе развіваць нацыянальную самасвядомасць вучняў, дазволіць ажыццяўляць пераемнасць духоўнай культуры пакаленняў.

МГПУ им. И.П. Шамякина